# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

ISSN 1993-1999

5
2024



# ЗМЕСТ

**2024 — ГОД ЯКАСЦІ**

*Круглы стол "Вехі памяці і славы" (да 79-годдзя Вялікай Перамогі)*


ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Аляксандр Касовіч** — **Мемарыялізацыя падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гомельскай вобласці** 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

**Аляксандр Рацько, Аліна Новікава** — **Вайна далёкая і блізкая** *(ураджэнкі Казахстана ў партызанскім руху Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны)* 10

АДУКАЦЫЯ XXI СТАГОДДЗЯ

**Ольга Стрелова** — **Маньчжурская стратегическая наступательная операция в фотообъективе и поэтической тетради военных корреспондентов** 16

ІМГНЕННЕ Ў КАДРЫ

**З Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў** 26, 41

ГІСТОРЫЯ ДЫПЛАМАТЫІ

**Віталь Барабаш** — **Да пытання аб нацыянальнай палітыцы СССР і польскага эміграцкага ўрада ў адносінах да Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны** 27

КРАЯЗНАЎСТВА

**Алена Ведзь** — **Чонкі: старонкі гісторыі аднаго паселішча** 35

ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

**Уладзімір Здановіч, Аляксей Літвін, Аляксандр Цымбал** — **Руплівы даследчык ваеннай гісторыі** *(да 70-годдзя з дня нараджэння Сяргея Яўгеньевіча Новікава)* 38

РЭХА ГІСТОРЫІ

**Юрый Раемскі** — **З Баранавічаў у Магілёў. Абставіны пераносу Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў жніўні 1915 г.** 42

ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ

**Ігар Палюховіч, Арцём Давыдчанка** — **Фартыфікацыйныя збудаванні Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Пінскага раёна** 48

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

**Аляксей Каплієў** — **Першая сусветная вайна ў люстэрку публіцыстыкі і ваенна-гістарычнай думкі 1914—1941 гг.** 52

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Вячаслаў Лазіцкі, Ірына Яленская** — **Тэсты па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці"** 56

МУЗЕЙНАЯ ПЕДАГОГІКА

**Татьяна Денисеня** — **Фронтовые дороги земляков** *(занятие в народном историко-краеведческом музее Денисковичской СШ)* 66

**Содержание/Summary** 72



***Да ведама аўтараў.*** *Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, давядзенне да ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса), а таксама на рэдагаванне і скарачэнне матэрыялу па меркаванні рэдакцыі. Папярэджваем аб прававой абароне аўтарскіх правоў на змешчаныя матэрыялы. Перадрук магчымы толькі з дазволу рэдакцыі з абавязковай спасылкай на "Беларускі гістарычны часопіс".*

## Паважаныя чытачы!

Са жніўня 2022 г. у "Беларускім гістарычным часопісе" існуе рубрыка "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці". Матэрыялы, якія друкуюцца ў ёй, маюць на мэце навуковае і дыдактыка-метадычнае суправаджэнне выкладання гэтай вучэбнай дысцыпліны ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

У № 1 часопіса за 2023 г. змешчаны артыкул дацэнта кафедры эканомікі і бізнесу Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Вячаслава Лазіцкага "Электронны вучэбна-метадычны комплекс "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці як дыдактычны сродак навучання" (с. 6–9). Ён прысвечаны структуры і змястоўнаму напаўненню ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне, які дазваляе інтэграваць у адукацыйны працэс сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Важнай часткай вучэбна-метадычнага комплексу з'яўляюцца сродкі кантрольна-дыягнастычнай дзейнасці, прадстаўленыя ў тым ліку ў тэставай форме.

У адпаведнасці з п. 11 і 13 Дарожнай карты развіцця часопіса, зацверджанай у 2023 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэдакцыя пачынае публікацыю комплексу тэставых заданняў па гісторыі беларускай дзяржаўнасці як часткі распрацаванага ЭВМК, падрыхтаванага выкладчыкамі Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія могуць быць выкарыстаны пры ажыццяўленні кантрольна-дыягнастычнай і ацэначнай дзейнасці.



**Вячаслаў ЛАЗІЦКІ**
*Дацэнт кафедры эканомікі і бізнесу Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Сфера навуковых інтарэсаў: навукова-метадычнае суправаджэнне стварэння і сістэмнага прымянення электронных сродкаў навучання па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах; фарміраванне і развіццё інфармацыйнай кампетэнтнасці як складовай часткі інфармацыйнай культуры асобы; прымяненне тэставых методык педагагічнай дыягностыкі і кантролю ведаў. Аўтар 4 манаграфій, 6 манаграфій у суаўтарстве, 19 дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, 5 электронных рэсурсаў, 80 навуковых і навукова-метадычных публікацый.*



**Ірына ЯЛЕНСКАЯ**
*Дацэнт кафедры эканомікі і бізнесу Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Сфера навуковых інтарэсаў: крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, гісторыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Аўтар больш за 180 навуковых публікацый.*

# Тэсты па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці"

Вывучэнне дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" арыентавана на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў аб гістарычным мінулым і асноўных кірунках развіцця беларускай дзяржавы. Важнымі аспектамі арганізацыі навучання з'яўляюцца кантроль і дыягностыка вучэбных дасягненняў студэнтаў. Тэставыя методыкі разам з выкарыстаннем іншых дыдактычных сродкаў навучання якасна павышаюць ступень праверкі ведаў і ўзроўню падрыхтаванасці навучэнцаў.

Кожны варыянт прапануемых тэставых комплексаў складаецца з 51 заданняў. Заданні 1—30 уяўляюць сабой тэставыя заданні закрытага тыпу. Яны патрабуюць выбару аднаго або некалькіх правільных варыянтаў адказаў. Кантролю падлягаюць тэарэтычныя і фактаслагічныя (у тым ліку і храналагічныя) кампаненты вучэбных гістарычных ведаў. Пры паспяховым і поўным выкананні дадзенай часткі студэнт можа максімальна атрымаць 30 балаў.

Выкананне тэставых заданняў адкрытага тыпу В1—В7 прадугледжвае вызначэнне дакладнай паслядоўнасці прапанаваных элементаў. Поўнае і дакладнае выкананне заданняў гэтай часткі тэставага комплексу дазволіць студэнту атрымаць 21 бал (па тры балы за кожнае з сямі заданняў).

Заданні В8—В14 з'яўляюцца тэставымі заданнямі адкрытага тыпу, а іх выкананне прадугледжвае вызначэнне прычынна-выніковых сувязяў пры дакладным суаднясенні элементаў двух мностваў, якія пазначаныя лічбамі і літарамі. Кожнаму элементу аднаго мноства адпавядае адзін элемент іншага прапанаванага мноства (пры гэтым у мностве з пяці элементаў адзін з'яўляецца лішнім, што павялічвае ўзровень складанасці задання). Максімум балаў, які студэнт здольны атрымаць пры поўным і верным выкананні дадзенай часткі, складзенай з сямі заданняў, роўны 28. Кожнае асобнае заданне на вызначэнне адпаведнікаў вылічва-

ецца з колькасці правільных адказаў (1+1+1+1+1). Аднак варыянт няпоўнага адказу можа быць і іншым (напрыклад, 1+0+1+0).

Заданні B15—B21 таксама ўяўляюць сабой тэставыя заданні адкрытага тыпу (у тым ліку на веданне гістарычнай картаграфіі). У дадзенай частцы тэставых комплексаў змешчаны заданні для кантролю факталагічнага і тэарэтычнага кампанентаў вучэбных ведаў на ўзроўні іх разумення студэнтамі. Дакладнае выкананне заданняў гэтай часткі тэставага комплексу дазволіць максімальна атрымаць 21 бал (па тры балы за кожнае з сямі заданняў). Такім чынам, пры поўным і правільным выкананні ўсяго комплексу тэставых заданняў студэнт можа атрымаць 100 балаў.

## *Тэставы комплекс па раздзелу 1 “Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці”*

### Варыянт 1

| № | Заданне | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| | **Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)** | |
| A1 | Форма палітычнай арганізацыі грамадства, з дапамогай якой рэгулююцца сумесная дзейнасць і ўзаемаадносіны людзей, існуе адзіная сістэма абароны іх правоў і суверэнітэту, — гэта: | 1) горад;<br>2) грамадства;<br>3) дзяржава;<br>4) улада. |
| A2 | Магчымасць і здольнасць навязаць сваю волю, уздзейнічаць на дзейнасць і паводзіны іншых людзей — гэта: | 1) войска;<br>2) манархія;<br>3) улада;<br>4) урад. |
| A3 | Дата прыгадвання ў “Аповесці мінулых гадоў” легендарнага запрашэння варагаў на Русь прыпадае на: | 1) 860 г.;<br>2) 862 г.;<br>3) 882 г.;<br>4) 980 г. |
| A4 | Полацкі князь, у перыяд княжэння якога княства дасягнула найбольшага росквіту, — гэта: | 1) Глеб Усяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Рагвалод;<br>4) Усяслаў Брачыславіч. |
| A5 | Старажытны беларускі горад, які ўпершыню згадваецца ў гістарычных крыніцах у сувязі з бітвай на Нямізе, — гэта: | 1) Брэст;<br>2) Мінск;<br>3) Полацк;<br>4) Тураў. |
| A6 | Аб развіцці дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях у IX—XIII стст. сведчаць (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) абменна-гандлёвыя сувязі насельніцтва ва ўмовах натуральнай гаспадаркі;<br>2) археалагічныя знаходкі керамікі і вырабаў з бронзы;<br>3) існаванне ўлады князя, распаўсюджанай на падуладнае насельніцтва;<br>4) правядзенне незалежнай палітыкі полацкіх князёў;<br>5) прыгадванне славян у гістарычных крыніцах;<br>6) рассяленне насельніцтва па кроўнароднаснай прыкмеце;<br>7) рассяленне насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце. |
| A7 | Першы гістарычна дакладна вядомы вялікі князь літоўскі — гэта: | 1) Альгерд;<br>2) Вітаўт;<br>3) Міндоўг;<br>4) Ягайла. |
| A8 | Адна з асаблівасцяў утварэння Вялікага Княства Літоўскага — гэта: | 1) значнае абвастрэнне рэлігійнага пытання на беларускіх землях;<br>2) зацікаўленасць польскай шляхты ў “залатых шляхецкіх вольнасцях”;<br>3) значны ўплыў знешнепалітычнага фактара — ваеннай пагрозы;<br>4) палітычны і эканамічны крызіс у Рэчы Паспалітай. |
| A9 | Рэч Паспалітая была ўтворана ў: | 1) 1385 г.;<br>2) 1468 г.;<br>3) 1569 г.;<br>4) 1596 г. |

| № | Заданне | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| **Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)** | | |
| A10 | Галоўнымі прычынамі падзелаў Рэчы Паспалітай з'яўляюцца (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) паражэнне ў Лівонскай вайне;<br>2) востры дынастычны крызіс;<br>3) зацікаўленасць уплывовых еўрапейскіх краін у паслабленні Рэчы Паспалітай;<br>4) імкненне шляхты да "залатых шляхецкіх вольнасцяў";<br>5) унутрыпалітычны і эканамічны крызіс у дзяржаве. |
| A11 | Апошні кароль Рэчы Паспалітай, у час праўлення якога беларускія землі былі далучаны да Расійскай Імперыі, — гэта: | 1) Жыгімонт I Аўгуст;<br>2) Жыгімонт II Аўгуст;<br>3) Станіслаў Аўгуст Панятоўскі;<br>4) Станіслаў Ляшчынскі. |
| A12 | Дата заключэння міждзяржаўнага пагаднення, згодна з якім Беласточчына была далучана да Расійскай Імперыі: | 1) 1772 г.;<br>2) 1793 г.;<br>3) 1795 г.;<br>4) 1807 г. |
| A13 | Канцэпцыя сярэдзіны XIX — пачатку XX ст., згодна з якой гістарычнасць беларусаў атаясамлівалася з вялікарускім этнасам, адмаўлялася іх самастойнасць і самабытнасць як этнічнай адзінкі, — гэта: | 1) паланізм;<br>2) заходнерусізм;<br>3) сарматызм;<br>4) шавінізм. |
| A14 | Адна з галоўных мэт паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг. — гэта: | 1) адмена прыгоннага права;<br>2) аднаўленне Рэчы Паспалітай;<br>3) прыняцце канстытуцыі;<br>4) скасаванне сялянскай абшчыны. |
| A15 | Гістарычная падзея, якая моцна паўплывала на працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1917—1918 гг., — гэта: | 1) абвяшчэнне ССРБ;<br>2) Першая расійская рэвалюцыя;<br>3) Першая сусветная вайна;<br>4) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| A16 | Дата ўтварэння ЛітБел ССР: | 1) 9 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 27 лютага 1919 г.;<br>4) 31 ліпеня 1920 г. |
| A17 | Міждзяржаўнае дыпламатычнае пагадненне, згодна з якім тэрыторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд знаходзілася ў складзе Польшчы, — гэта: | 1) Брэсцкі мір;<br>2) Версальскі мір;<br>3) Рыжскі мір;<br>4) Тыльзіцкі мір. |
| A18 | Гістарычныя падзеі, якія паўплывалі на працэс уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) абвяшчэнне БНР;<br>2) дэнансацыя Рыжскага міру з боку СССР;<br>3) напад Германіі на СССР;<br>4) пачатак Другой сусветнай вайны;<br>5) увод войск Чырвонай арміі на тэррыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны;<br>6) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд;<br>7) утварэнне ЛітБел ССР. |
| A19 | У час рэалізацыі стратэгічнага плана нападу Германіі на СССР наступленне на тэрыторыі Беларусі ажыццяўляла група армій, якая мела кодавую назву: | 1) "Поўдзень";<br>2) "Поўнач";<br>3) "Усход";<br>4) "Цэнтр". |
| A20 | Ва ўмовах акупацыі ўсвядомленае, добраахвотнае і наўмыснае супрацоўніцтва з ворагам у яго інтарэсах — гэта: | 1) інкарпарацыя;<br>2) калабарацыянізм;<br>3) люстрацыя;<br>4) нацыяналізм. |
| A21 | План каланізацыі і германізацыі акупаваных тэрыторый Усходняй Еўропы меў кодавую назву: | 1) "Барбароса";<br>2) "Блау";<br>3) "Вайс";<br>4) "Ост". |
| A22 | Першыя ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны партызаны Беларусі, якія былі ўзнагароджаны ганаровым званнем "Герой Савецкага Саюза" (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) Ц.Бумажкоў;<br>2) І.Казінец;<br>3) В.Корж;<br>4) Ф.Паўлоўскі;<br>5) А.Фёдараў. |

| № | Заданне | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| **Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)** | | |
| А23 | Прыкладам змянення міжнароднага статуса БССР у пасляваенны перыяд з'яўляўся: | 1) новы адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі;<br>2) удзел у стварэнні і дзейнасці ААН;<br>3) утварэнне наркамата замежных спраў замест міністэрства.<br>4) фарміраванне новага складу беларускай партыйна-гаспадарчай эліты. |
| А24 | Час пачатку працэса аднаўлення народнай гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны БССР прыпадае на: | 1) восень 1943 г.;<br>2) восень 1944 г.;<br>3) вясну—лета 1945 г.;<br>4) вясну—лета 1946 г. |
| А25 | Аднаўленне ў правах, аднаўленне страчанага добрага імя, адмена неабгрунтаванага абвінавачвання невінаватай асобы альбо групы асоб, — гэта: | 1) калабарацыя;<br>2) рэабілітацыя;<br>3) рэпатрыяцыя;<br>4) рэстытуцыя. |
| А26 | Аўтары зацверджанага ў 1955 г. Дзяржаўнага гімна БССР — гэта (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) У.Карызна;<br>2) М.Клімковіч;<br>3) С.Міхалкоў;<br>4) П.Панчанка;<br>5) Н.Сакалоўскі;<br>6) Г.Эль-Рэгістан. |
| А27 | Сістэма прававых, палітычных, маральных, філасофскіх, рэлігійных, мастацкіх поглядаў і ідэй, якія адлюстроўваюць пазіцыю палітычнай партыі, групы людзей або асобы, — гэта: | 1) галоснасць;<br>2) грамадства;<br>3) ідэалогія;<br>4) светапогляд. |
| А28 | Дата, на якую прыпадае пачатак дзеяння Дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза з удзелам Беларусі, Расіі, Казахстана, Арменіі, Кыргызстана, — гэта: | 1) 2003 г.;<br>2) 2008 г.;<br>3) 2010 г.;<br>4) 2015 г. |
| А29 | Усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны, — гэта: | 1) галоснасць;<br>2) дэмакратыя;<br>3) рэспубліка;<br>4) рэферэндум. |
| А30 | Падзеі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, якія адбыліся ў 1994 г., — гэта (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) абранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі;<br>3) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;<br>4) прыняцце першай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;<br>5) стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. |
| **Размясціце падзеі ў дакладнай гістарычнай паслядоўнасці (напрыклад, АБГВ):** | | |
| В1 | А) будаўніцтва ў Полацку сабора Святой Сафіі;<br>Б) высылка полацкіх князей у Візантыю;<br>В) прыняцце на Русі ў якасці афіцыйнай рэлігіі хрысціянства;<br>Г) утварэнне на тэрыторыі Беларусі славянскіх саюзаў плямён. | |
| В2 | А) Альгерд; Б) Вітаўт; В) Гедзімін; Г) Ягайла. | |
| В3 | А) дзейнасць беларускіх народнікаў;<br>Б) заканчэнне ўваходжання беларускіх земель у склад Расійскай Імперыі;<br>В) скасаванне ўніяцтва рашэннямі Полацкага царкоўнага сабора;<br>Г) стварэнне першай беларускай палітычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) | |
| В4 | А) абвяшчэнне БНР;<br>Б) абвяшчэнне ССРБ;<br>В) утварэнне ЛітБел ССР;<br>Г) утварэнне СССР. | |
| В5 | А) ажыццяўленне вермахтам ваеннага стратэгічнага плана "Вайс";<br>Б) поўная акупацыя тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;<br>В) пачатак рэалізацыі ваеннага стратэгічнага плана вермахта "Барбароса";<br>Г) разгортванне шырокага і масавага партызанскага і падпольнага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі. | |
| В6 | А) пачатак першых мерапрыемстваў па аднаўленню народнай гаспадаркі БССР;<br>Б) поўнае вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;<br>В) прыняцце Канстытуцыі БССР ("Канстытуцыя развітога сацыялізма");<br>Г) удзел БССР ва ўтварэнні ААН. | |
| В7 | А) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>Б) абранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>В) прыняцце першай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;<br>Г) стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. | |

| № | Заданне | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| | ***Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (напрыклад, 1В2Г3Б4Д):*** | |
| В8 | 1) Брачыслаў Ізяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Усяслаў Брачыславіч;<br>4) Юрый Яраславіч. | А) барацьба Полацка з Яраславам Мудрым за кантроль над волакамі;<br>Б) барацьба Полацкага княства з крыжакамі;<br>В) барацьба Турава за незалежнасць ад Кіева;<br>Г) будаўніцтва сабора Святой Сафіі ў Полацку;<br>Д) заснаванне Полацкага епіскапства. |
| В9 | 1) 1385 г.;<br>2) 1468 г.;<br>3) 1569 г.;<br>4) 1588 г. | А) Крэўская унія;<br>Б) Люблінская унія;<br>В) прыняцце Судзебніка Казіміра Ягелончыка;<br>Г) прыняцце ІІІ Статута ВКЛ;<br>Д) стварэнне Трыбунала ВКЛ. |
| В10 | 1) Беласток;<br>2) Вільня;<br>3) Мінск;<br>4) Полацк. | А) “Курлоўскі расстрэл”;<br>Б) дзейнасць групы беларускіх народнікаў “Гоман”;<br>В) пачатак выдання першай легальнай беларускай газеты “Наша Доля”;<br>Г) скасаванне ўніяцтва;<br>Д) уваходжанне Беласточчыны ў склад Расійскай Імперыі згодна ўмоў Тыльзіцкага міра. |
| В11 | 1) абвяшчэнне БНР;<br>2) абвяшчэнне ЛітБел ССР;<br>3) абвяшчэнне ССРБ;<br>4) утварэнне БСРГ. | А) З.Жылуновіч, А.Чарвякоў;<br>Б) В.Міцкявічус-Капсукас, К.Цыхоўскі;<br>В) А.Смоліч, А.Луцкевіч;<br>Г) Б.Тарашкевіч, П.Мятла;<br>Д) В.Харужая, С.Прытыцкі. |
| В12 | 1) абарона Брэсцкай крэпасці;<br>2) абарона Магілёва;<br>3) вызваленне Мінска ад нацысцкіх захопнікаў;<br>4) дзейнасць калабаранцкіх арганізацый ў перыяд акупацыі ў час Вялікай Айчыннай вайны. | А) Ф.Акінчыц, І.Ермачэнка, Ф.Кушаль;<br>Б) А.Бурдзейны, М.Паноў, Д.Фролікаў;<br>В) П.Гаўрылаў, І.Зубачоў, Я.Фамін;<br>Г) А.Ермакоў, І.Русіянаў, В.Юшкевіч;<br>Д) С.Куцепаў, І.Мазалаў, М.Раманаў. |
| В13 | 1) кіраўніцтва АН БССР;<br>2) кіраўніцтва ЦК КПБ;<br>3) стварэнне ўзорнага эскіза Дзяржаўнага сцяга БССР;<br>4) утварэнне ААН. | А) М.Гусеў;<br>Б) К.Кісялёў;<br>В) У.Крукоўскі;<br>Г) В.Купрэвіч;<br>Д) К.Мазураў. |
| В14 | 1) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>2) выкарыстанне вышэйшых форм волевыяўлення народа;<br>3) пераход да прэзідэнцкай формы кіравання;<br>4) распад СССР. | А) галоснасць;<br>Б) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;<br>В) рэферэндум;<br>Г) “адліга”;<br>Д) “парад суверэнітэтаў”. |
| В15 | ____________ тэорыя адлюстроўвае навуковы падыход, згодна якому ў працэсе ўзнікнення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян вырашальная ўплывовая роля належала варагам (нарманам). | |
| В16 |  Старажытны беларускі горад, які з’яўляўся цэнтрам збірання зямель у адзіную дзяржаву ў сярэдзіне XIII ст.<br>*(выберыце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2МІНСК):* | |
| В17 | ____________ — гэта паняцце (тэрмін), якое азначае гістарычны працэс уключэння ў склад іншай дзяржавы. | |
| В18 | ____________ — абрэвіятура, якая пазначае скарочаную назву беларускай дзяржавы, абвешчанай згодна Маніфеста 1 студзеня 1919 г. | |
| В19 | __________ — паняцце, якім пазначаюць планамернае фізічнае знішчэнне насельніцтва шляхам забойства і іншых дзеянняў, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў перыяд акупацыі ў часы Вялікай Айчыннай вайны. | |

| | |
|---|---|
| В20 |  Беларускі горад, які быў абвешчаны сталіцай СНД у 1991 г. (*выберыце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2БРЭСТ*): |
| В21 | Згодна Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1998 г. штогод кожную другую нядзелю мая адзначаецца дзяржаўнае свята —___________. |

## Варыянт 2

| № | Заданні | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| ***Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)*** | | |
| А1 | Тэрытарыяльны саюз (аб'яднанне, супольнасць) грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх правоў на жыццё, свабоду, маёмасць, — гэта: | 1) горад;<br>2) грамадства;<br>3) дзяржава;<br>4) улада. |
| А2 | Прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы вызначаецца паняццем: | 1) грамадзянства;<br>2) суверэнітэт;<br>3) улада;<br>4) урад. |
| А3 | Дата першага ўзгадвання Полацка ў гістарычных крыніцах: | 1) 860 г.;<br>2) 862 г.;<br>3) 882 г.;<br>4) 980 г. |
| А4 | Полацкі князь, у перыяд княжэння якога сімвалам магутнасці княства стала будаўніцтва сабора Святой Сафіі, — гэта: | 1) Глеб Усяславіч;<br>2) Ізяслаў Уладзіміравіч;<br>3) Рагвалод;<br>4) Усяслаў Брачыславіч. |
| А5 | Старажытны беларускі горад, які з'яўляўся прыкладам сумеснага кіравання князем і пасаднікам, — гэта: | 1) Брэст;<br>2) Мінск;<br>3) Полацк;<br>4) Тураў. |
| А6 | Прыклады назваў найбольш буйных усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў, якія рассяліліся на беларускіх землях у VIII—IX стст. (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) бужане;<br>2) дрыгавічы;<br>3) крывічы;<br>4) радзімічы;<br>5) улічы;<br>6) ціверцы. |
| А7 | Дата каранацыі Міндоўга: | 1) 1251 г.;<br>2) 1253 г.;<br>3) 1263 г.;<br>4) 1284 г. |
| А8 | Князь ВКЛ, пры якім тэрыторыя дзяржавы дасягнула найбольшых памераў і магутнасці, — гэта: | 1) Альгерд;<br>2) Вітаўт;<br>3) Гедзімін;<br>4) Ягайла. |
| А9 | Фактар, які значна паўплываў на ўтварэнне Рэчы Паспалітай, — гэта: | 1) ваенныя паражэнні ў Лівонскай вайне;<br>2) націск крыжакоў;<br>3) шматлікія набегі татар;<br>4) унутрыдынастычны крызіс. |

| № | Заданні | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| **Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)** | | |
| A10 | Знешнія пагрозы, якія паўплывалі на дзяржаваўтваральныя працэсы ў Верхнім Панямонні (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) крыжакі;<br>2) манголы;<br>3) Вялікае Княства Маскоўскае;<br>4) Польскае каралеўства;<br>5) Шведскае каралеўства. |
| A11 | Кіраўнік Расійскай Імперыі, у час праўлення якога беларускія землі ўвайшлі ў склад гэтай дзяржавы, — гэта: | 1) Аляксандр I;<br>2) Кацярына II;<br>3) Павел I;<br>4) Пётр I. |
| A12 | Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай Імперыі ажыццяўлялася палітыка: | 1) беларусізацыі;<br>2) дэпаланізацыі;<br>3) вестэрнізацыі;<br>4) акаталічвання. |
| A13 | Моцным фактарам, які паўплываў на фарміраванне “краёвага” патрыятызму ў другой палове XIX ст. на беларускіх землях, стала ажыццяўленне: | 1) буржуазных рэформ;<br>2) паланізацыі і акаталічвання;<br>3) русіфікацыі і абмежаванняў у дачыненні католікаў і яўрэяў;<br>4) развіцця нацыянальнага руху і ўзнікнення палітычных партый. |
| A14 | Падзеі ў гісторыі Беларусі XIX ст., якія сведчаць пра імкненне да вырашэння пытання аднаўлення дзяржаўнасці, — гэта (выберыце некалькі правільных адказаў): | 1) паўстанне 1830—1831 гг.;<br>2) паўстанне 1863—1864 гг.;<br>3) паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі;<br>4) распрацоўка “Плана Агінскага”;<br>5) распрацоўка “Плана М. Лорыс-Мелікава”;<br>6) рэформы П. Кісялева;<br>7) рэформы П. Сталыпіна. |
| A15 | Гістарычныя падзеі, якія моцна паўплывалі на працэс развіцця нацыянальнага руху на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст., — гэта (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) абвяшчэнне БНР;<br>2) абвяшчэнне ССРБ;<br>3) Першая расійская рэвалюцыя;<br>4) Першая сусветная вайна;<br>5) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| A 16 | Крытэрый, які аб’ядноўвае вызначаныя даты: 1919 г., 1927 г., 1937 г., — гэта: | 1) правядзенне на тэрыторыі Беларусі рэферэндумаў;<br>2) прыняцце канстытуцый, якія замацоўвалі прынцыпы беларускай дзяржаўнасці;<br>3) прыняцце Дзяржаўнага Сцяга і Дзяржаўнага Гімна БССР;<br>4) узбуйненні тэрыторыі БССР у міжваенны перыяд. |
| A17 | Дата ўтварэння СССР: | 1) 9 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 30 снежня 1922 г.;<br>4) 30 кастрычніка 1939 г. |
| A18 | 28—30 кастрычніка 1939 г. адбылося: | 1) абвяшчэнне Устаўных грамат БНР;<br>2) падпісанне Дагавора аб стварэнні СССР;<br>3) прыняцце Дэкларацыі аб усталяванні савецкай улады ў Заходняй Беларусі і рэзалюцыі “Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР”;<br>4) прыняцце Канстытуцыі ССРБ і абвяшчэнне ЛітБел ССР. |
| A19 | Другая сусветная вайна пачалася: | 1) 1 жніўня 1939 г.;<br>2) 1 верасня 1939 г.;<br>3) 22 чэрвеня 1941 г.;<br>4) 22 ліпеня 1941 г. |
| A20 | Кіраўніком БШПР з’яўляўся: | 1) Ц.Бумажкоў;<br>2) П.Калінін;<br>3) В.Корж;<br>4) П.Панамарэнка. |
| A21 | Назва ўсходніх рабочых, вывезеных у гады Другой сусветнай вайны германскімі захопнікамі з акупаваных тэрыторый на прымусовыя работы ў Германію і еўрапейскія краіны, якія знаходзіліся ў складзе германскага блока: | 1) калабаранты;<br>2) крэсавякі;<br>3) остарбайтары;<br>4) рэпатрыянты. |

| № | Заданні | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| | **Выберыце правільны (правільныя) варыянты адказу (адказаў)** | |
| А22 | Буйныя лагеры смерці па колькасці знішчаных ахвяр на тэрыторыі Беларусі, — гэта (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) Азарычы;<br>2) Асвенцым;<br>3) Майданак;<br>4) Трасцянец;<br>5) Трэблінка. |
| А23 | Дата падпісання Статута ААН кіраўніком дэлегацыі БССР у ліку краін — заснавальніц гэтай міжнароднай арганізацыі: | 1) 19 лютага 1943 г.;<br>2) 18 сакавіка 1945 г.;<br>3) 26 чэрвеня 1945 г.;<br>4) 31 жніўня 1945 г. |
| А24 | Працэс вяртання на радзіму ваеннапалонных, перамешчаных асоб, бежанцаў, эмігрантаў з аднаўленнем у правах грамадзянства — гэта: | 1) калабарацыя;<br>2) рэабілітацыя;<br>3) рэпатрыяцыя;<br>4) рэстытуцыя. |
| А25 | Дзяржаўны гімн БССР быў прыняты ў: | 1) 1945 г.;<br>2) 1951 г.;<br>3) 1955 г.;<br>4) 1961 г. |
| А26 | Беларускі мастак — аўтар графічнага ўзору Дзяржаўнага сцяга БССР у 1951 г. — гэта: | 1) М. Гусеў;<br>2) М. Клімковіч;<br>3) У. Крукоўскі;<br>4) Н. Сакалоўскі. |
| А27 | Паказчык накіраванасці знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая арыентавана ў стасунках дзяржавы з рознымі рэгіенамі, краінамі свету і міжнароднымі арганізацыямі, — гэта: | 1) полікультурнасць;<br>2) поліканфесійнасць;<br>3) сацыяльная арыентаванасць;<br>4) шматвектарнасць. |
| А28 | Дата падпісання Белавежскіх пагадненняў кіраўнікамі Беларусі, Украіны і Расіі: | 1) 27 ліпеня 1990 г.;<br>2) 19 верасня 1991 г.;<br>3) 8 снежня 1991 г.;<br>4) 15 сакавіка 1994 г. |
| А29 | Крытэрый, па якім аб'яднаны даты важных падзей сацыяльна-палітычнага жыцця Рэспублікі Беларусь: 1994 г., 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г., — гэта: | 1) выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>2) правядзенне рэферэндумаў па найважнейшых пытаннях развіцця краіны;<br>3) правядзенне Усебеларускіх народных сходаў;<br>4) прыняцце рэдакцый Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. |
| А30 | Даты, якія з'яўляюцца этапнымі ў развіцці інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй, — гэта (выберыце некалькі правільных варыянтаў): | 1) 15 сакавіка 1994 г.;<br>2) 2 красавіка 1996 г.;<br>3) 24 лістапада 1996 г.;<br>4) 2 красавіка 1997 г.;<br>5) 8 снежня 1999 г.;<br>6) 17 кастрычніка 2004 г. |
| | ***Размясціце падзеі ў гістарычнай паслядоўнасці (напрыклад, АБГВ):*** | |
| В1 | А) бітва на р. Няміга;<br>Б) заснаванне Полацкага і Тураўскага епіскапстваў;<br>В) легендарнае запрашэнне варагаў на Русь;<br>Г) пачатак барацьбы Полацкага княства і яго саюзнікаў з крыжакамі. | |
| В2 | А) бітва на р. Ворскла;<br>Б) бітва на р. Сінія Воды;<br>В) бітва на р. Стрэве;<br>Г) бітва пад Грунвальдам. | |
| В3 | А) дзейнасць групы "Гоман";<br>Б) дзейнасць Таварыстваў філаматаў і філарэтаў;<br>В) заснаванне "Дэмакратычнага таварыства";<br>Г) стварэнне першых палітычных партый (ПСР, БСГ, Бунд). | |
| В4 | А) абвяшчэнне Устаўных грамат БНР;<br>Б) абвяшчэнне Маніфеста аб стварэнні ССРБ;<br>В) існаванне ЛітБел ССР;<br>Г) падпісанне Рыжскага мірнага дагавора. | |

| № | Заданні | Варыянт (варыянты) адказу (адказаў) |
|---|---|---|
| | ***Размясціце падзеі ў гістарычнай паслядоўнасці (напрыклад, АБГВ):*** | |
| B5 | А) напад Германіі на СССР;<br>Б) пачатак Другой сусветнай вайны;<br>В) пачатак акупацыі тэрыторыі Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне;<br>Г) стварэнне партызанскіх зон на акупаванай тэрыторыі Беларусі. | |
| B6 | А) абвяшчэнне палітыкі перабудовы;<br>Б) лібералізацыя сацыяльна-палітычнага жыцця ў рэспубліцы ў часы “адлігі”;<br>В) прыняцце Канстытуцыі БССР (“Канстытуцыя развітога сацыялізма”);<br>Г) рэалізацыя пасляваеннага плана аднаўлення народнай гаспадаркі БССР. | |
| B7 | А) аварыя на ЧАЭС;<br>Б) падпісанне дамоўленасцяў аб інтэграцыі Беларусі і Расіі;<br>В) путч Дзяржаўнага камітэту па надзвычайнаму становішчу;<br>Г) ратыфікацыя Белавежскіх пагадненняў Вярхоўным Саветам Беларусі. | |
| | ***Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (напрыклад, 1В2Г3Б4Д):*** | |
| B8 | 1) Брачыслаў Ізяславіч, Усяслаў Брачыславіч;<br>2) Рагнеда, Ізяслаў;<br>3) Святаполк Уладзіміравіч, Юрый Яраславіч;<br>4) Уладзімір Полацкі, Вячка. | А) барацьба беларускіх княстваў з татарамі;<br>Б) барацьба Полацка і саюзнікаў з крыжакамі;<br>В) правядзенне Полацкам незалежнай ад Кіева палітыкі ў XI—XII стст.;<br>Г) правядзенне Туравам незалежнай ад Кіева палітыкі;<br>Д) першыя прыклады хрысціянізацыі. |
| B9 | 1) барацьба за першынство ў збіранні ўсходнеславянскіх зямель;<br>2) вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў ВКЛ;<br>3) дэмаграфічны і эканамічны крызіс;<br>4) узнікненне федэратыўнай дзяржавы. | А) войны з Маскоўскай дзяржавай;<br>Б) вынікі Паўночнай вайны;<br>В) падзелы Рэчы Паспалітай;<br>Г) Крэўская унія;<br>Д) Люблінская унія. |
| B10 | 1) “Гоман”;<br>2) “Загляне сонца і ў наша аконца”;<br>3) “Мужыцкая праўда”;<br>4) “Наша Ніва”. | А) К. Каліноўскі, Ф. Ражанскі;<br>Б) В. Ластоўскі, А. Уласаў;<br>В) А. Марчанка, Х. Ратнер;<br>Г) Б. Тарашкевіч, П. Мятла;<br>Д) Б. Эпімах-Шыпіла, В. Іваноўскі. |
| B11 | 1) 3 сакавіка 1918 г.;<br>2) 1 студзеня 1919 г.;<br>3) 3 лютага 1919 г.;<br>4) 18 сакавіка 1921 г. | А) абвяшчэнне Дэкларацыі аб стварэнні ЛітБел ССР;<br>Б) абвяшчэнне Маніфеста аб стварэнні ССРБ;<br>В) заключэнне Дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй;<br>Г) заключэнне Брэст-Літоўскага мірнага дагавора;<br>Д) заключэнне Рыжскага мірнага дагавора. |
| B12 | 1) першы вызвалены ад нацысцкай акупацыі населены пункт Беларусі;<br>2) Горад, у якім адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі;<br>3) першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыклад выкарыстання рэактыўных мінамётаў;<br>4) першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыклад выкарыстання “шкляной артылерыі”. | А) Беласток;<br>Б) Камарын;<br>В) Магілёў;<br>Г) Мінск;<br>Д) Орша. |
| B13 | 1) аварыя на ЧАЭС;<br>2) падпісанне Белавежскіх пагадненняў;<br>3) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі;<br>4) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. | А) 26 красакавіка 1986 г.;<br>Б) 27 ліпеня 1990 г.;<br>В) 8 снежня 1991 г.;<br>Г) 15 сакавіка 1994 г.;<br>Д) 8 снежня 1999 г. |
| B14 | 1) 1994 г., 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2015 г., 2020 г.;<br>2) 1994 г., 1996 г., 2004 г., 2021 г.;<br>3) 1995 г., 1996 г., 2004 г., 2022 г.;<br>4) 1996 г., 2001 г., 2006 г., 2010 г., 2016 г. | А) правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;<br>Б) правядзенне рэферэндумаў у Рэспубліцы Беларусь;<br>В) правядзенне Усебеларускіх народных сходаў;<br>Г) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і яе новых рэдакцый;<br>Д) этапы развіцця інтэграцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. |
| B15 | __________ ____________ — гэта гістарычны працэс, прыкметамі якога ў феадальных дзяржавах з’яўлялася іх драбленне і ўсобіцы паміж князямі — кіраўнікамі асобных зямель і валасцей. | |

| **№** | **Заданні** | **Варыянт (варыянты) адказу (адказаў)** |
|---|---|---|
| | ***Правільна суаднясіце элементы двух мностваў (напрыклад, 1В2Г3Б4Д):*** | |
| В16 |   Старажытны беларускі горад, у якім адбылося пасяджэнне другога “нямога” сейма Рэчы Паспалітай (*выберыце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2МАГІЛЁЎ*): | |
| В17 | У часы імператара Мікалая І 19 кастрычніка 1831 г. быў прыняты закон “Аб ____________ ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей”. | |
| В18 | ____________ — дата прыняцця Канстытуцыі БССР, у якой упершыню быў замацаваны статус Мінска ў якасці сталіцы рэспублікі. | |
| В19 | “____________” — назва стратэгічнай наступальнай аперацыі Чырвонай арміі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, у выніку якой тэрыторыя БССР была поўнасцю вызвалена ад нацысцкіх захопнікаў. | |
| В20 |   Беларускі горад, які на момант заканчэння Вялікай Айчыннай вайны разглядаўся ў якасці варыянта пераносу сталіцы БССР з разбуранага ў часы акупацыі Мінска (*выберыце лічбу на карце і назву, напрыклад: 2БРЭСТ*): | |
| В21 | Незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае ўмяшання звонку, гэта дзяржаўны _____. | |

# *КЛЮЧЫ ДА ТЭСТАВАГА КОМПЛЕКСУ*

## Варыянт 1

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| А1 | 4 | А18 | 245 | В5 | АБВГ |
| А2 | 3 | А19 | 4 | В6 | БАГВ |
| А3 | 2 | А20 | 2 | В7 | АГВБ |
| А4 | 4 | А21 | 4 | В8 | 1А2Д3Г4В |
| А5 | 2 | А22 | 14 | В9 | 1А2В3Б4Г |
| А6 | 347 | А23 | 2 | В10 | 1Д2В3А4Г |
| А7 | 3 | А24 | 1 | В11 | 1В2Б3А4Г |
| А8 | 3 | А25 | 1 | В12 | 1В2Д3Б4А |
| А9 | 3 | А26 | 25 | В13 | 1Г2Д3А4Б |
| А10 | 35 | А27 | 3 | В14 | 1А2В3Б4Д |
| А11 | 3 | А28 | 4 | В15 | нарманская/варажская |
| А12 | 4 | А29 | 4 | В16 | 1Навагародак |
| А13 | 2 | А30 | 14 | В17 | інкарпарацыя |
| А14 | 2 | В1 | ГВАБ | В18 | ССРБ |
| А15 | 3 | В2 | ВАГБ | В19 | генацыд |
| А16 | 3 | В3 | БВАГ | В20 | 1Мінск |
| А17 | 3 | В4 | АБВГ | В21 | Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга |

## Варыянт 2

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| А1 | 3 | А18 | 3 | В5 | БАВГ |
| А2 | 1 | А19 | 2 | В6 | ГБВА |
| А3 | 2 | А20 | 2 | В7 | АВГБ |
| А4 | 4 | А21 | 3 | В8 | 1В2Д3Г4Б |
| А5 | 4 | А22 | 14 | В9 | 1А2Г3Б4Д |
| А6 | 234 | А23 | 3 | В10 | 1В2Д3А4Б |
| А7 | 2 | А24 | 3 | В11 | 1Г2Б3А4Д |
| А8 | 2 | А25 | 3 | В12 | 1Б2А3Д4Г |
| А9 | 1 | А26 | 1 | В13 | 1А2В3Д4Б |
| А10 | 12 | А27 | 4 | В14 | 1А2Г3Б4В |
| А11 | 2 | А28 | 3 | В15 | палітычная раздробленасць |
| А12 | 2 | А29 | 1 | В16 | 1Гродна |
| А13 | 3 | А30 | 245 | В17 | разборы шляхты |
| А14 | 1246 | В1 | ВБАГ | В18 | 1927 |
| А15 | 34 | В2 | ВБАГ | В19 | Баграціён |
| А16 | 2 | В3 | БВАГ | В20 | 4Магілеў |
| А17 | 3 | В4 | АБВГ | В21 | суверэнітэт |